# ОТ РЕДАКЦИИ
# АД РЭДАКЦЫІ
# EDITORIAL

Пытанне зямлі і волі ў яго шырокім значэнні стаяла вельмі востра на працягу так званага доўгага XIX стагоддзя на тэрыторыі амаль усёй Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Звычайнаму абывацелю, які не заглыбляецца ў гістарычныя праблемы, можа здавацца, што гэта пытанне тычылася выключна справы ўласнасці на зямлю і асабістай свабоды сялян і што змяненне пэўных прававых норм – наданне сялянам волі і перадача ім зямельных надзелаў – выпраўляла сітуацыю і адкрывала шлях да хуткага капіталістычнага развіцця. З аднаго боку, сапраўды так і было, але калі паглядзець на пытанне больш уважліва, то становіцца відавочным, што сутнасць праблем прыгонніцтва і феадальных перажыткаў крыецца ў глыбінных гаспадарчых адметнасцях жыцця і светапоглядзе людзей у розных частках Еўропы пачынаючы як мінімум ад Сярэдневякоўя. У пазнейшы перыяд гэта адбілася на асаблівасцях дзяржаваўтваральных працэсаў, паколькі доўгае існаванне прыгоннага права ва Усходняй Еўропе значна замаруджвала працэсы нацыянальнай эмансіпацыі сялянства, фарміравання гарадоў і гарадской субкультуры, рынку і рыначных адносін, культуры міжасабовых зносін, развіцця інфармацыйнай прасторы і новага светапогляду. Інакш нельга растлумачыць ні запозненасць многіх працэсаў капіталістычных пераўтварэнняў у краінах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, ні тыя іх асаблівасці, якія спадарожнічалі народам гэтай часткі кантынента ў шляху да мадэрнізацыі ў XIX–XXI стст. Шмат адметнасцей выяўляецца і пры паглыбленні ў праблематыку адмены прыгоннага права ў асобных частках Расійскай імперыі, у іншых рэгіёнах Усходняй Еўропы. У сферу гаспадаркі і права ўжо ў XIX ст. умешваецца яшчэ і палітыка. Гэта таксама адзін з тых аспектаў, які цікавіць сёння даследчыкаў пры вывучэнні з'явы прыгонніцтва.

Адмена прыгону не толькі перафармаціравала гаспадарчыя і прававыя адносіны, але і глыбінна змяніла сацыяльную структуру грамадства, прыспешыла ўзнікненне новых сацыяльных сувязей і структур, паскорыла сацыяльную мабільнасць, перайначыла традыцыйны вобраз вёскі. Разам з тым прыгонніцтва ўсё роўна пакідала ў спадчыну шматлікія рудыменты, якія адбіліся на гістарычным фундаменце Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і якія выразна адчуваюцца, хоць і ў трансфармаваным выглядзе, да гэтага часу. Фактычна ў з'яве прыгонніцтва мы маем справу з адным з найбольш выразных і важных маркёраў адметнага шляху гаспадарчага, ментальнага і псіхагістарычнага развіцця народаў Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, а нават і дзяржаваўтваральных працэсаў на гэтых тэрыторыях.

Безумоўна, адмена прыгону, як і любыя іншыя тэктанічныя і прарыўныя змены ў жыцці людзей, што выводзяць грамадства на новы ўзровень развіцця, не магла не мець сваіх бенефіцыяраў, як і тых, хто нешта страчваў у выніку правядзення гэтай рэформы. Як бы там ні было, але ўсё грамадства наогул, канечне, выступала бенефіцыярам гэтых рэвалюцыйных перамен. Вывучэнню складаных механізмаў трансфармацый, запушчаных адменай прыгоннага права, мадэрнізацыйных змен у сферы міжсаслоўных, гаспадарчых і сацыяльных адносін, якія ахоплівалі грамадства, а таксама адметнасцей функцыянавання і адмены прыгону ў беларускіх губернях прысвечаны артыкулы тэматычнага раздзела.

У артыкуле прафесара А. Г. Каханоўскага «Пачатак трансфармацыі беларускай вёскі» разглядаюцца праблемы пачатку сістэмнай трансфармацыі беларускай вёскі ў выніку рэформы 1861 г., пераходу ад традыцыі да мадэрну, змены сацыяльна-эканамічнай арганізацыі і культурнага жыцця вёскі, дэмаграфічных паводзін і іншыя аспекты жыцця сельскага насельніцтва. Аўтар акцэнтуе ўвагу на тым, што прыгонная гаспадарка ў Беларусі напярэдадні яе скасавання была прадстаўлена шырэй, чым у многіх іншых рэгіёнах Расійскай імперыі, а змены ва ўмовах адмены прыгоннага права на тэрыторыі Беларусі, здзейсненыя ўладамі Расійскай імперыі ў сувязі з паўстаннем 1863 г., мелі па глыбіні наступстваў фактычна характар самастойнай рэформы.

У артыкуле А. В. Бурачонка «Прамыслова-гандлёвае развіццё Мінска ў канцы XIX – пачатку XX ст.» на аснове матэрыялаў справаводства і статыстычных крыніц Расійскай імперыі даследуецца развіццё галоўных напрамкаў прадпрымальніцкай дзейнасці ў Мінску ў акрэслены перыяд, паказаны колькасныя і якасныя змены ў галіне прамысловасці і гандлю, ахарактарызаваны стан крэдытнай справы, выяўлены інстытуцыянальныя змены ў эканамічным жыцці горада ў парэформенны перыяд. У высновах паказаны ўплыў мадэрнізацыйных працэсаў на развіццё дзелавой актыўнасці гараджан у канцы XIX – пачатку XX ст.

Г. І. Маскевіч у артыкуле «Сельская грамада ў Беларусі пасля адмены прыгоннага права» вызначае ролю і функцыі сельскай грамады ў Беларусі пасля 1861 г. праз выяўленне адрозненняў паміж тэрмінамі «грамада» і «абшчына», паказвае афіцыйную структуру сельскай грамады і яе нефармальны ўплыў на сялянскае жыццё ў Беларусі.

У артыкуле А. Б. Арлукевіча «Ваенны пастой і пастойная павіннасць у Беларусі (сярэдзіна 1850-х – сярэдзіна 1870-х гг.)», які завяршае тэматычны раздзел, раскрываецца прырода воінскага пастою і пастойнай павіннасці эпохі аляксандраўскіх рэформ, якія ў маштабах Расійскай імперыі аказаліся найбольш распаўсюджанымі менавіта ў беларускіх губернях, але да апошняга часу не станавіліся прадметам даследавання беларускіх гісторыкаў. Аўтар паказвае, што ваенны пастой па прычыне асаблівага геастратэгічнага становішча беларускіх губерняў у сярэдзіне 1850-х – сярэдзіне 1870-х гг. з'яўляўся неад'емным атрыбутам паўсядзённага жыцця сотняў тысяч іх жыхароў.